ПАДЗЕЯ

# СТАРОНКІ ПАМЯЦІ НЯЗГАСНАЙ




**На XXXII Мінскай міжнароднай кніжнай выставе-кірмашы дэлегацыя пісьменнікаў Гродзеншчыны прадставіла кнігу «Памяці вечны агонь», зборнік літаратурна-мастацкіх твораў, прысвечаных 80-й гадавіне вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.**

Дэлегацыя Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі прыняла ўдзел у Мінскім кніжным форуме ў дзень яго ўрачыстага адкрыцця – 12 сакавіка. Ідэйнай асновай выступленняў літаратараў Прынёмання стала тэма Вялікай Айчыннай вайны, 80-годдзя Перамогі і вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкай акупацыі. На кніжнае свята ў сталіцу сёлета традыцыйна прыехалі гродзенцы і прадстаўнікі некалькіх раёнаў вобласці, паэты, празаікі, публіцысты.




Як адзначыла ў сваёй прамове старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ, Заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь Людміла Антонаўна Кебіч, сёння ў Беларусі няма сям'і, якая б не адчула болю ад трагічнага дотыку вайны. І таму няма важнейшай задачы, чым увекавечанне памяці пра подзвіг народа, які гераічна выстаяў і перамог фашызм. Выкананню гэтай святой задачы прысвячаецца наша кніга. Пакуль мы жывыя, у нашых сэрцах будзе вечным агнём гарэць, будзе жыць і наша памяць…

Цыкл грамадскіх прэзентацый сумеснага літаратурна-асветніцкага праекта Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі і Гродзенскага гарадскога савета ветэранаў, кнігі «Памяти вечный огонь» стартаваў у пачатку 2025 года і поўным ходам ідзе па навучальных установах горада над Нёманам. Як паведамлялася раней, адметнай рысай новага калектыўнага выдання стаў удзел у ім не толькі пісьменнікаў, але і аматараў літаратуры, ветэранаў працы і моладзі. Тэматыка неўміручай народнай памяці і любові да славутых продкаў-ветэранаў згуртавала, аб'яднала вельмі розных людзей. Падчас знаёмства з кнігай у чарговы раз пераконваешся ў тым, што ніякія спробы перакроіць гісторыю,

не здольныя змяніць свядомасць сапраўдных беларусаў. Пра гэта выказаўся ў крытычным аглядзе зборніка адзін з яго складальнікаў і рэдактараў, член СПБ, паэт, публіцыст Дзмітрый Радзівончык. На галоўнай сцэне XXXII Мінскай міжнароднай кніжнай выставы-кірмашу з уласнымі творамі ваенна-патрыятычнай тэматыкі выступілі: паэтэсы Людміла Кебіч, Кацярына Каламійцава, Вольга Алізар; паэт Андрэй Татур; празаік Ірына Салата; дзіцячая пісьменніца Таццяна Сучкова; публіцыст Уладзімір Ягорычаў (Гродна); а таксама паэтэса Таццяна Яцук (Навагрудскі раён), паэты Аляксандр Марозаў (Астравецкі раён) і Руслан Півавараў (Ліда). Зборнік «Памяти вечный огонь» можна метафарычна назваць кнігай-абеліскам, таму што гэта сапраўдны літаратурны мемарыял, тэматычны культурны аб’ект, які абуджае гістарычную памяць, натхняе і мабілізуе наша грамадзянскае сумленне.

Мінская кніжная выстава-кірмаш – гэта заўсёды вялікая колькасць разнастайных мерапрыемстваў, цікавых і прыемных сустрэч з сябрамі, калегамі з іншых гарадоў і абласцей рэспублікі. Сёлета арганізатарамі сталічнага кніжнага форуму зроблены акцэнт на літаратуры рэгіёнаў. Таму пачалося знаходжанне тут дэлегацыі Прынёманскага краю з наведвання кніжнага павільёна Гродзенскай вобласці (*на фота*). Тут на паліцах можна было заўважыць калектыўныя літаратурныя праекты Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі – кнігі «Памяти вечный огонь» (да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкай акупацыі) і «Лепшы горад Зямлі» (да 895-годдзя горада Гродна), а таксама некаторыя індывідуальныя аўтарскія выданні, накіраваныя ў экспазіцыю павільёна пісьменніцкай арганізацыяй Гродзенскай вобласці.









***

Адбыліся выступленні і сустрэчы з нашымі аўтарамі ў павільёнах айчынных кніжных выдавецтваў. Напрыклад, Людміла Кебіч і Таццяна Сучкова па запрашэнні Выдавецкага дома «Звязда» выступілі перад дзіцячай аўдыторыяй (*на фота*).







На дзіцячай пляцоўцы Выдавецкага дома «Звязда» выступае член СПБ, дзіцячая пісьменніца з Гродна Таццяна Сучкова






Людміла Кебіч. Так выглядае любоў маленькіх чытачоў









Аўтар 10 кніг, беларускі празаік з Гродна Ірына Салата з новай кнігай «Русалчына затока» ў павільёне выдавецтва «Беларусь»

Разам з калегамі з Мінска і Гомеля дэлегацыя Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ была запрошана на сустрэчу з нядаўна абраным старшынёй Саюза пісьменнікаў Расіі Уладзімірам Мядзінскім і дырэктарам Дэпартамента дзяржаўнай падтрымкі перыядычнага друку і кніжнай індустрыі ва ўрадзе Расійскай Федэрацыі Уладзімірам Грыгор’евым, а таксама наведала міжнародны літаратурны сімпозіум «Пісьменнік і час».






Пісьменнікі Прынёманскага краю паўдзельнічалі ў статыстычным апытанні, дзе мелі магчымасць назваць свае сімпатыі ў літаратуры, шчыра падзяліцца ўласным разуменнем лёсу сучаснай кнігі і кнігавыдання. А адказам на галоўнае пытанне «Што для вас кніга?» можа паслужыць плённая

супольная праца літаратурнай сям'і Прынёмання, усё наша жыццё – такое разнастайнае, насычанае, а галоўнае, цікавае і карыснае сучаснаму чытачу. Удзел у XXXII Мінскай міжнароднай кніжнай выставе-кірмашы – толькі адна з яго шматлікіх старонак.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На фота:** падчас знаходжання дэлегацыі Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі на XXXII Мінскай міжнароднай кніжнай выставе-кірмашы ў дзень урачыстага адкрыцця форуму 12 сакавіка 2025 года.



З ганаровым старшынёй СПБ, Народным пісьменнікам Беларусі Мікалаем Чаргінцом



З лаўрэатам Нацыянальнай літаратурнай прэміі, празаікам Зіновіем Прыгодзічам (Мінск)






Сустрэчы на палях форуму. Л. А. Кебіч і старшыня СПБ-Гомель, празаік  Уладзімір Гаўрыловіч



Л. А. Кебіч і старшыня Мінскага абласнога аддзялення СПБ, празаік, публіцыст Леанід Крыванос



Гродзенскі паэт Андрэй Татур
на адной з інтэрактыўных лакацый



Л. А. Кебіч і першы намеснік старшыні
Саюза пісьменнікаў Беларусі Алена Стэльмах



Л. А. Кебіч
і лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі,
паэт Анатоль Аўруцін (Мінск)




У Расіі часопісы займаюцца выданнем кніг


МОСКВА КНИЖНАЯ


БИБЛИОТЕКА


ВЕНЕСУЭЛА


КУБА


КНИГИ ИЗ РОССИИ
КНИГИ ИЗ РОССИИ
ЧИТАЕМ ВМЕСТЕ ПО-РУССКИ И ПО-БЕЛОРУССКИ


КНИГИ ИЗ
РОССИИ
ЧИТАЕМ ВМЕСТЕ ПО-РУССКИ
И ПО-БЕЛОРУССКИ
КНИГИ ИЗ
РОССИИ
ЧИТАЕМ ВМЕСТЕ ПО-РУССКИ
И ПО-БЕЛОРУССКИ






Старшыня ГрАА СПБ Л. А. Кебіч. Прэзентацыя кнігі «Памяти вечный огонь»




Дзмітрый Радзівончык. Крытычны агляд кнігі




Кацярына Каламійцава




Вольга Алізар




Ірына Салата




Андрэй Татур




Руслан Півавараў




Таццяна Яцук



Аляксандр Марозаў



Уладзімір Ягорычаў






Таццяна Сучкова







***Фота***
Дзмітрыя Радзівончыка,
Анатоля Яцука,
Святланы Арлюк,
Руслана Піваварава